Грамадскае незалежнае выданне, выходзіць са студзеня 1997 года

Газета для вас

21 лютага 1998 года
СУБОТА
№ 14(94)
Наш індэкс 63834

Цана па падпісцы — 1000 руб.
Цана ў розніцу — 1500 руб.

ІВАЦЭВІЧЫ - БАРАНАВІЧЫ - БЯРОЗА

Звычайная шыльда на ўваходзе: Святавольская сельская бальніца. Звычайныя хворыя, якія павольна тупаюць па калідоры. Спрабую пагутарыць з імі яшчэ не прадстаўляючыся медыкам, незаўважанай.

Немалады мужчына расказвае, як раптам страціў прытомнасць, завіхаючыся за дамашнімі справамі. Калі б не хуткая дапамога Віктара Міхайлавіча Калічонка, які маментальна прыехаў і вывеў з гіпертанічнага крызу, то прыйшлося б, відаць, развітацца з жыццём.

Нас абступаюць іншыя хворыя, кожнаму хочацца выказаць сваё, набалелае. Бачу шчырасць і падзяку. Мяне запэўніваюць, што ў бальніцы, хаця даводзіцца ляжаць у сваім адзенні, можна спадзявацца на цёплую падтрымку, клопат, на магчымасць атрымаць неабходныя лекі.

● ЮБІЛЕІ



СВЯТАВОЛЬСКАЙ БАЛЬНІЦЫ — 30 ГАДОЎ

— У Івацэвічах заўсёды пацвярджаецца дыягназ, які ставіць Віктар Міхайлавіч, — гэта апошняе, што ставіць кропку над усёй размовай.

Гутарка з хворымі не застаецца незаўважанай, да нас падыходзяць медсёстры. Яны чымсьці ўсхваляваны. Пераходзім у невялікі пакойчык, дзе жанчыны наперабой расказваюць пра свае клопаты. Хварэюць дзеці. У санітаркі Зоі Рыгораўны Джэжоры на той момант дзве дачкі ляжалі ў бальніцы. У адной запаленне лёгкіх, у другой бранхіт. Дачка акушэркі Марыі Канстанцінаўны Куратнік таксама часта трапляе на бальнічны ложак. Усе яны школьніцы.

Марыя Канстанцінаўна расказвае, як днямі нават званіла да старшыні Івацэвіцкага райвыканкама. У мясцовай школе тэмпературная шкала не перавышае 8—10 градусаў цяпла. Дзеці амаль усю зіму не здымаюць верхняе адзенне. Дый яно не дапамагае. Трапляюць сюды, у бальніцу, па некалькі разоў. Але, відаць, слабая ацяпляльная сістэма мясцовай школы і яе «вынікі» не турбуюць івацэвіцкіх чыноўнікаў...

Як акушэрка, Марыя Канстанцінаўна сочыць за парадзіхамі, абараняе яшчэ не народжанае жыццё. Мне хочацца больш даведацца аб яе рабоце, а канкрэтна, аб нараджальнасці. Сумныя лічбы. За мінулы год нарадзілася толькі 14 дзетак. Гэта ў межах Святавольскага сельскага Савета. Калісьці ў бальніцы было радзільнае аддзяленне, дзе за год пачыналі новае жыццё каля 100 дзетак. У 1970 годзе радзільнае аддзяленне было закрыта. Парадзіх, якіх вельмі мала, накіроўваюць у Івацэвічы.

А смяротнасць? Жахлівы факт, яна ў два разы перавышае нараджальнасць...

Не заўважылі мы, як у пакойчык непрыкметна зайшла Марыя Васільеўна Калічонак — галоўны ўрач Святавольскай бальніцы. Марыя Васільеўна – такая ўся светлая, прыгожая і ветлівая. І гэта потым аб ёй прама на вуліцы скажуць вяскоўцы: наш доктар.

А там, у бальніцы, крыху няёмка стала, што не адразу зайшла да яе, гаспадыня тут яна. Прызнацца, не люблю начальства.

Але перада мной стаяла доктарка, засяроджаная паўсядзённымі справамі, заклапочаная. Мы прайшлі ў невялікі кабінет галоўнага ўрача, і Марыя Васільеўна папрасіла напісаць перш за ўсё аб тых, хто дапамог адрамантаваць бальніцу. Будынку 30 гадоў, даўно патрэбен быў неадкладны капітальны рамонт. У дзяржавы на гэту справу сродкаў няма. Прыйшлі на дапамогу праўленні калгасаў імя Чапаева, Мічурына, Калініна. А больш за ўсё кранае душу папка, дзе ў доўгіх спісах стаяць прозвішчы сяльчан, хто прыняў свой пасільны ўклад у аднаўленні бальніцы. Аляксандр Мікалаевіч Гарбавец з вёскі Вялікая Гаць раней лячыўся тут. Ён пастараўся абыйсці сяльчан і сабраць 4079 тысяч рублёў.

З вёскі Святая Воля Ірынай Трафімаўнай Джэжорай было сабрана 6500 тысяч рублёў. Тут жа акуратная справаздача, на што расходаваны тыя грошы.

Кранаюць подпісы, якія старанна выводзілі бабулькі ды дзяды, маладзіж няшмат у вёсках. Што рухала імі? Шчырая падзяка, усведамленне сітуацыі ці проста клопаты аб сабе? Відаць, усё разам. Галоўнае, грошы выкарыстаны разумна.

... Марыю Васільеўну выклікаюць. Гляджу ў невялікае акно і – цуд: адсюль, з невялічкага бальнічнага пакойчыка, цераз усё вёску выразна відаць дзіўныя царкоўныя купалы. Потым мы доўга яшчэ сядзім за доктарскім сталом.

Пакрыху даведваюся аб звычайнай і не зусім звычайнай гісторыі чалавечага жыцця. Звычайнай таму, што былі мары лячыць людзей, і яны здзейсніліся. А незвычайнае – аб моцнай жанчыне, якая не дазваляе сабе расслабляцца ў цяжкіх абставінах, якая бярэ на сябе шмат. Напрыклад, акрамя ўрачэбнай справы ўзяла на свае плечы і будаўніцтва амбулаторыі. Прыгожы яе будынак зараз маляўніча ўпісваецца ў пейзаж маладых дрэўцаў бальнічнай тэрыторыі. Тут шмат кабінетаў, ёсць лабараторыя з дыягнастычным абсталяваннем, кабінет фізіпрацэдураў. Як і ў бальніцы, адзіны почырк – чысціня і ўтульнасць.

Гэта не першыя выпрабаванні, якія сустрэліся на жыццёвых дарогах Марыі Васільеўны Калічонак. Быў выпуск Куйбышаўскага медыцынскага інстытута. Першыя хворыя ў спякотным Азербайджане, куды накіравалі яе з мужам на працу. Вельмі мала было піцявой вады і вынік – хвароба Боткіна, брушны тыф.

А потым Германія, куды накіравалі мужа. Менавіта там, за мяжой, Марыя Васільеўна спасцігла шмат чаго з сучаснай медыцыны.

Аб многім хацелася б запытацца, але ведаю, там, на бальнічных ложках, яе чакаюць, спадзяюцца. І ўсё ж апошняе:

— Дзе бярэце сілы?

— Іду ў лес, там цішыня, прыгажосць, можна расслабіцца, набыць унутраную раўнавагу. Выпадкаў колькі, і ўсе розныя. І званкі ноччу. Пакладуць хворага ўначы, здаецца, усё ў парадку, але пакуль сама не пабачу, не супакоюся. Бывае, прымаю валер'янку. Нельга аддзяліць сябе ад чужых пакутаў. А калі крытычная сітуацыя, чытаю ціхенька «Ойча наш»! Толькі аб гэтым не пішыце...

На вуліцы ўсё яшчэ цярушыць снег. Ведаю, у гэтай вёсцы жыве яшчэ адна жанчына, з якой непасрэдна звязана дзейнасць Святавольскай сельскай бальніцы. Заслужаны ўрач Надзея Афанасьеўна Корзан – зараз пенсіянерка. Гэта яе намаганнямі пабудавана Святавольская бальніца, створаны дзеяздольны калектыў медыкаў, які з дня ў дзень тры дзесяцігоддзі дапамагае людзям аднаўляць здароўе. Гэта яна ўдыхнула, калі можна так сказаць, жыццё і медыцынскую сілу ў сцяны звычайнай сельскай бальніцы.

Бальніца, дарэчы, разлічана на 35 ложка-месцаў, але лечыцца тут амаль заўсёды значна больш хворых. Іх вязуць з усяго раёна, і тут яны атрымліваюць не толькі кваліфікаванае медыцынскае лячэнне, але і чалавечую спагаду, чуласць. Святло міласэрнасці нясуць людзям урач Віктар Міхайлавіч Калічонак, фельчар Аксана Валер'яўна Стрэчань, лабарантка Надзежда Навумаўна Джэжора (якіх вы бачыце на здымку нашага фотакарэспандэнта), санітарка Зоя Рыгораўна Джэжора, акушэрка Марыя Канстанцінаўна Куратнік, увесь калектыў сельскай бальніцы.

Л. ТАМАРЫНА.

Фота А. ГАНЧУКА.

● НАВІНЫ РЭСПУБЛІКІ

Эва Спыхальска пакідае Беларусь па патрабаванні свайго ўрада

"Я падала заяву аб сваёй адстаўцы з пасады пасла і буду працаваць у Адміністрацыі прэзідэнта Аляксандра Квасьнеўскага", — паведаміла Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Польшчы ў нашай краіне Эва Спыхальска на сустрэчы з першым віцэ-прэм'ерам Пятром Пракаповічам, якая адбылася 13 лютага.

Паводле слоў дыпламата, яе рашэнне выклікана жаданнем не ўскладняць рознагалоссі паміж кіраўніком польскага знешнепалітычнага ведамства, які выступіў з патрабаваннем аб яе адкліканні з Беларусі, і прэзідэнтам краіны Аляксандрам Квасьнеўскім, які лічыць, што Эва Спыхальска павінна працягваць працу ў Мінску.

Час, праведзены ў нашай рэспубліцы, пасол назвала вельмі цікавым перыядам у сваім жыцці. Яна лепш пазнала Беларусь, пасябравала з многімі людзьмі. І хоць, на думку Эвы Спыхальскай, не ўсё ўдалося зрабіць, што планавалася, яна спадзяецца на далейшае развіццё беларуска-польскіх узаемаадносін.

З пачатку 1998 года Беларусь запазычыла Расіі за газ 80 мільёнаў долараў

Складаная сітуацыя ўзнікла ў Беларусі з аплатай паставак расійскага газу.

Як стала вядома БелаПАН, на рабочай нарадзе, якая прайшла ў беларускім урадзе 12 лютага, першы віцэ-прэм'ер Пётр Пракаповіч прывеў наступныя лічбы: з пачатку гэтага года рэспубліка запазычыла Расіі за ўжыты газ 80 мільёнаў долараў ЗША. Такім чынам, адзначыў віцэ-прэм'ер, фактычна за адзін месяц Беларусь запазычыла Расіі за газ больш, чым за папярэднія два гады. У 1997 годзе, як вядома, удалося не толькі забяспечыць усе бягучыя плацяжы, але і пагасіць больш за 100 мільёнаў долараў запазычанасці папярэдніх гадоў.

Колькасць грошай на рахунках прадпрыемстваў і насельніцтва ў студзені зменшылася

Рублёвая грашовая маса ў Беларусі ў студзені скарацілася з 42 да 39,7 трыльёна рублёў, або на 4,4 працэнта. У яе складзе найбольш значна — на 1,2 трыльёна рублёў, або на 9,7 працэнта, зменшыліся наяўныя грошы ў абарачэнні. Яны склалі ў канцы месяца 27,9 працэнта ўсёй грашовай масы.

Паводле звестак, што паступілі з прэс-службы Упраўлення інфармацыі Нацбанка Беларусі, агульная колькасць грошай на бягучых і разліковых рахунках прадпрыемстваў, насельніцтва і мясцовых органаў кіравання знізілася на 2,1 трыльёна рублёў, або на 9,5 працэнта. Іх велічыня на канец студзеня склала 19,5 трыльёна рублёў, або 49,1 працэнта грашовай масы.

Тэрміновыя дэпазіты ўкладчыкаў у банках краіны ўзраслі за месяц на 960 мільярдаў рублёў, або на 12 працэнтаў.

Рукі — замена тэхніцы


За мінулы год на сельгаспрадпрыемствы рэспублікі паступіла каля 2,5 тысячы трактароў, 110 збожжаўборачных і 428 кормаўборачных камбайнаў, каля 30 бульбаўборачных агрэгатаў і 300 грузавых аўтамабіляў. Нягледзячы на гэта, колькасць спісанай тэхнікі за апошнія тры гады значна перавышае аб'ёмы набытай. Цяпер, як сцвярджаюць спецыялісты Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання краіны, забяспечанасць вёскі сродкамі механізацыі знізілася да ўзроўню 70-ых гадоў. У сувязі з нездавальняючым абнаўленнем машынна-трактарнага парку і нястачай спецыялізаваных механізмаў амаль дзве трэці работнікаў сельскай гаспадаркі заняты ручной працай.

ЦІ ПАДПІСАЛІСЯ ВЫ НА "ГАЗЕТУ ДЛЯ ВАС" НА ДРУГІ КВАРТАЛ? НЕ СПАЗНІЦЕСЯ.

СЛАВУТЫЯ ЗЕМЛЯКІ

Мікалай ЯРЧАК: "НАВУКА — ГЭТА СЭНС ЖЫЦЦЯ"

Хто мог падумаць тады, у 50-я гады, што звычайны хлопец з вёскі Гошчава Івацэвіцкага раёна стане сёння сусветна вядомым вучоным, вынаходнікам унікальнай хімічнай тэорыі і новых класаў рэчываў, аднаму з якіх, дарэчы, дасць імя сваёй вёскі. Доктар хімічных навук, акадэмік міжнароднай акадэміі навук Еўразіі, прафесар ВСПШ г. Седльцэ (Польшча) — ягоныя ганаровыя званні. Болей таго, амерыканскі біяграфічны інстытут уключыў яго прозвішча ў лік 500 уплывовых лідэраў свету за апошнія 25 год. І сёння ў нас у гасцях гэты не зусім звычайны чалавек — загадчык кафедры хіміі Брэсцкага Дзяржуніверсітэта ЯРЧАК М. П.



— Мікалай Пятровіч, спачатку скажыце некалькі слоў пра сябе...

— Нарадзіўся я ў в. Гошчава ў 1950 г. Вельмі пашчасціла з бацькамі. Яны імкнуліся даць дзецям рознабаковыя веды. Маці, часам, сама недаядала, а карміла нас. Толькі зараз разумею, якім цяжкім было тады жыццё, і я вельмі ўдзячны бацькам за ўсё. Удзячны я і настаўнікам Гошчаўскай школы, у першую чаргу Літоўчык Веры Рыгораўне за тое, што ўзяла мяне, 6-гадовага хлопца, у свой клас. То быў вельмі рэдкі выпадак, бо ў школу бралі з 7-мі год. Мяне нават паўгода не запісвалі ў класны журнал.

Усю сваю душу аддавала нам настаўніца хіміі Белая Яўгенія Піліпаўна. Што самае цікавае, з нашага невялікага класа выйшла два дактары навук і адзін кандыдат, усе ў хіміі.

У 1966 г. я скончыў школу з сярэбраным медалём і паступіў на хімфак БДУ. Пасля яго заканчэння паступіў у аспірантуру Рыжскага інстытута арганічнага сінтэзу. За тры гады зрабіў кандыдацкую (вельмі рэдкі выпадак), у 75-м абараніў яе і стаў самым маладым кандыдатам навук. А ў 91-м абараніў доктарскую. За ўсім гэтым стаіць велізарнейшая праца. Навука — гэта сэнс жыцця навукоўца, усё яго жыццё.

— Я Вас ведаю яшчэ і як вынаходніка новай хімічнай тэорыі...

— Так. У 1979 г. я стварыў уласную тэорыю кампенсацыі электрычнага поля малекул. Спачатку яе ўспрынялі насцярожана. Але тэарэтычныя разлікі дакладна супадалі з эксперыментальнымі. Каб даказаць і распрацаваць яе, прыйшлося перагарнуць горы літаратуры, шмат эксперыментаваць. Яна развіваецца, дапаўняецца з кожным месяцам і ўсё больш відавочна яе універсальнасць, бо тлумачыць многія, нетлумачальныя дагэтуль хімічныя з'явы. Тэорыя зараз ужо даступна кожнаму студэнту і выкладаецца ў нашым універсітэце і ў Седльцы.

— Можна як-небудзь коратка, зразумела для чытачоў, раскрыць яе сутнасць?

— Даволі складана. Самая ідэальная сістэма ў прыродзе — атам гелія. Але нідзе не тлумачыцца, за кошт чаго ён такі стабільны. І вось такая стопрацэнтная кампенсацыя аднаго электрона другім — гэта мадэль, да якой імкнуцца ўсе рэакцыі і рэчывы з мэтай максімальна скампенсаваць сваё электрычнае поле. Як гэта адбываецца — мая ўласная распрацоўка. Калі ўзяць школьны курс, то тэорыя тлумачыць, напрыклад, чаму серная кіслата моцная і так добра паглынае ваду, а вугальная — слабая, чаму падобнае раствараецца ў падобным, чаму не выпарваецца газ з запальнічкі і г. д. Шмат пытанняў, якія не маюць адказу ў хіміі, вельмі проста тлумачыцца тэорыяй.

— А на Захадзе яе ведаюць!

— Я дакладваў яе на міжнародных кангрэсах у Польшчы, Германіі, Францыі. Гэтым летам збіраюся ў Італію. Апрабацыя тэорыі была самая сур'ёзная.

— А дзе Вашу тэорыю можна выкарыстаць на практыцы?

— Даволі хутка я выкарыстаў яе для стварэння новага класа рэчываў. Справа ў тым, што зямная кара на 90% складаецца з аксіду крэмнію — пяску. Не адно пакаленне хімікаў спрабавала стварыць з яго растваральныя і трывалыя ў вадзе злучэнні. Але безвынікова. Дзякуючы ўласным тэарэтычным даследаванням, літаральна «на кончыку алоўка», нарадзілася ідэя іх стварэння, а затым і створаны самыя рэчывы, названыя электрычна стабілізаванымі сіланатамі.

— Вельмі цікава было б пачуць, як Вам удалося ўвекавечыць імя сваёй вёскі ў міжнародных хімічных каталогах!

— Далей мне ўдалося распрацаваць болей складаныя рэчывы — таксама першыя ў свеце. Яны і атрымалі назву Гошчава-сіланаты. Каб назва была прызнана, трэба згода экспертаў. Скарочаную назву можна даць па першых літарах і складах хімічнай назвы рэчыва, атрымалася — Гошчава. Такім чынам былі афармлены заяўкі на аўтарскія пасведчанні, і яны прайшлі. Была адзіная заўвага, што для замежнікаў назва будзе складанай з-за шыпячых гукаў. Вось тут мне прыйшлося раскрыць карты і сказаць, што гэта яшчэ і геаграфічная назва. Больш пытанняў не было.

— Колькі ж усяго адкрыццяў на Вашым рахунку?

— Я фактычна стварыў 5 новых класаў рэчываў, гэта вельмі многа. Не ведаю ні ў Беларусі, ні ў Латвіі чалавека, які меў бы 1 клас. А ўсяго ў мяне 26 аўтарскіх пасведчанняў і адзін амерыканскі патэнт.

— Але Вы пакінулі Рыгу, прэстыжны інстытут...

— Мяне заўсёды цягнула на радзіму і пасля абароны доктарскай дысертацыі вырашыў абавязкова перадаць свае веды студэнтам Беларусі, каб яны адразу набывалі добры тэарэтычны ўзровень. Сёння, каб не быць сярод адсталых краін, трэба многа ўкладваць сродкаў у адукацыю і навуку. Няма іншага спосабу, каб народ, дзяржава зажылі лепей. Прыклад таму — Нарвегія, якая набыла незалежнасць у 1905 г. Эканомілі на ўсім, людзі галадалі, бо краіна гарыстая, а яны аддзяліліся ад сельскагаспадарчай Швецыі. Але ў той жа час залажылі фундамент універсітэта ў Трансгейме. Зараз гэты ўніверсітэт — цэнтр еўрапейскай навукі, а, магчыма, і сусветнай. І краіну Нарвегію, якая ёсць сёння, стварыў менавіта ён. Сёння Нарвегія займае 1-е месца па ўзроўню жыцця ў Еўропе, і ўжо шведы прыязджаюць сюды на заробкі. А студэнты з самых развітых краін стараюцца трапіць сюды на вучобу.

—А які на Ваш погляд узровень ведаў нашых студэнтаў?

— Для гэтага трэба паглядзець падручнікі. Вось расійскі, выдадзены ў Маскве ў 1997 г. Як і 40 год назад, злучэнні пішуцца з памылкамі, матэрыял устарэлы. А беларусы чытаюць толькі расійскую літаратуру. Для добрых ведаў трэба лепшая сусветная літаратура на замежных мовах. Таму студэнты павінны валодаць англійскай, французскай, нямецкай мовамі, а найперш, сваёй роднай — беларускай, бо праз яе можна здабыць вельмі многае. Напрыклад, які сэнс мае слова «калодзеж»? Яно складанае: кало—кола і дзеж—дзяжа. Дзяжа — гэта драўляны посуд для замешвання цеста. Раней бетонных калодзежных калец не было, замест іх ужываліся вялікія дзежы без дна. Людзі выбіралі пясок, ставілі дзяжу на дзяжу і так гэтае кола апускалася, пакуль не даходзіла да вады. У расійскай мове асэнсаваць слова «колодец» цяжкавата, бо яно запазычанае з беларускай і перакаверканае так, што губляецца яго сэнс. А што азначае слова «кола»? Першабытныя людзі мелі за зброю камень ці драўляны кол. Забіўшы калом звера, напрыклад, зубра, нехта, каб было лягчэй цягнуць яго, паклаў пад зубра кол і пакаціў. Уяўляеце радасць таго чалавека? Кол-а! Так з'явілася кола. Яно стала міжнародным: Каляда, каляндар, калона. Тое, што мы лічым, як занесенае з іншых моў, — наша ўласнае вынаходніцтва і тлумачыцца вельмі проста роднай мовай. Так вось, у чалавека, што валодае роднай мовай, ужо на генным узроўні закладзены сур'ёзны грунт.

— Гошчава, Вы наведваеце яго?

— Вельмі люблю наведваць Гошчава, родны кут, школу. Летась наш клас з'ехаўся з розных мясцін, сустрэўся. Гэта было цудоўна.

— А як аднавяскоўцы ставяцца да Вашай папулярнасці? Ці ведаюць?

— Можа і не ведаюць. Але я хачу пажадаць ім здароўя, шчасця. І каб не спадзяваліся на ніякага добрага дзядзьку, а самыя стварылі дабрабыт, каб Беларусь заквітнела і стала цудоўнай краінай.

Гутарыў М. СІНКЕВІЧ.

ВАШЕ ЗДОРОВЬЕ

Грипп ... нужно вылежать

Как уже сообщала наша газета, грипп в этом году «запаздывает», и его вспышка ожидается в конце февраля—начале марта. Поэтому еще раз возвращаемся к этой теме и советуем прислушаться к советам врача.

Грипп и исходные с ним по клиническому течению острые респираторные заболевания, являются самыми распространенными заболеваниями человека. Неблагоприятно воздействуют на организм, ослабляют его защитные силы, могут вызывать тяжелые осложнения: воспаление легких, среднего уха, поражение почек, сердца, мозга и т. д. Причиной гриппа и др. ОРЗ являются мельчайшие микроорганизмы — вирусы, которых насчитывается до 100 видов.

Первые признаки гриппа: сухость во рту, жжение, саднение в носу, носоглотке и глотке. Через несколько часов появляется сухой кашель, боли в горле, заложенность носа. На второй день присоединяется головная боль, ломота в суставах, тянущие боли в пояснице. Человек ощущает слабость, разбитость, повышение температуры до 38°С.

Грипп и ОРЗ передается от больного человека здоровому с мельчайшими капельками мокроты и слюны, которые при кашле и чихании разлетаются на расстояние до 3 метров, а при разговоре до 1—1,5 метра.

Почувствовав недомогание, вы должны вызвать врача, лечь в постель, накрыться теплым одеялом. Вы не должны ходить на работу, в школу и т. д. Не становитесь источником инфекции для окружающих. Членам семьи, где находится больной гриппом, необходимо соблюдать меры личной профилактики: носить ватно-марлевую повязку, посуду больного ставить отдельно от другой посуды, чаще проветривать помещение, где лежит больной.

Для профилактики гриппа и др. ОРЗ можно использовать оксолиновую мазь. Ей смазывают слизистую оболочку носовых ходов несколько раз в день. Оксолиновая мазь снижает вероятность заболевания в 2 и более раз. Желательно наносить мазь перед выходом из дома или непосредственно перед контактом с больным. Мазь безвредна и не вызывает побочных эффектов.

Не следует отказываться от таких средств народной медицины, как лук и чеснок. Их натирают на мелкой терке и вдыхают пары 2 раза в день по 10—15 минут в течение 10—14 дней. Можно применять настой чеснока (2—3 зубчика мелко нарезать, залить 1/4 стакана кипятка, настаивают 1—2 часа и закапывают по 2 капли в каждую ноздрю, через два дня настой меняют). Полезно принимать настой шиповника, он хорошо повышает сопротивляемость организма и ускоряет выздоровление.

При высокой температуре тела кладут холодный пузырь на голову, растирают тело спиртом, водкой. Рекомендуется обильное питье с добавлением клюквы, лимона, брусники. Чтобы уменьшить головную боль, дают таблетку анальгина, аскофена, цитрамона или парацетамола. Если сильный насморк, закапывают в нос раствор нафтизина, глазолина, санорина. Полоскать зев нужно содовым раствором, отварами ромашки, эвкалипта или календулы. Для уменьшения кашля употребляют отхаркивающие средства (алтейка, мукалтин, пертусин, бромгексин, тусупрекс), препараты расширяющие бронхи (эуфиллин), а также теплое и горячее питье — молоко с боржоми или пищевой содой, отвар липового цвета, чай с малиновым вареньем.

Уже при появлении первых признаков заболевания можно применять ингаляции. Для ингаляции используют разные составы: поваренная соль (желательно не «Экстра»), пищевая сода, минеральные воды, масла эвкалиптовое, ментоловое и настои из различных сборов трав растений и другие. При использовании масел дозировка должна быть такой: 2—5 капель на 250 мл. кипятка.

А что надо сделать, чтобы вообще избежать гриппа и других ОРЗ? Ведь некоторые люди не болеют даже в страшные эпидемии. Грипп и другие ОРЗ можно избежать при помощи проведения профилактических мероприятий, таких как закаливание, соблюдение мер личной гигиены. Наиболее эффективные приемы закаливания — водные процедуры с постепенным снижением температуры, утренняя гимнастика, вечерние прогулки, походы в выходные дни, отказ от излишне теплой одежды и вредных привычек.

Ну, а если вы все-таки заболели гриппом, то народная мудрость гласит: «Грипп любит, чтобы его вылежали». Медицина с этим вполне согласна.

Т. МИКИТИЧ,
врач-валеолог
Ивацевичского РТМО.

ПОЖИВЁМ — УВИДИМ с 23 февраля по 1 марта

ПОНЕДЕЛЬНИК, 23

БТ

7.00 Доброе утро, Беларусь!
8.00 Резонанс.
8.50 Телебарометр.
9.05, 19.25 "Сегодня с вами..."
9.45 Док. фильм.
10.00, 18.20 "Глухарь".
10.55 Дневник XVIII зимних Олимпийских игр.
11.10 Бездельник.
11.40 Теленавигатор.
12.00 К Дню защитников Отечества. Концерт солдатской песни.
13.00, 15.00, 18.00, 0.15 Новости.
13.10 "Девочка ищет отца". Худ. фильм.
14.40 Параграф.
15.10 ТВ— школе. Музыка. 6-й класс.
15.40 Мультфильм.
15.50 "Остров". Программа, посвященная воинам-интернационалистам.
16.30 Регион.
17.00 "Колесо времени". Слово о Дне защитников Отечества.
17.25 "Родовод".
17.55, 19.15, 20.30 "Не служить — Родине служить". Юмористическое поздравление.
19.20 Белорусский хит-парад.
19.25 "Сегодня с вами".
20.00 Третий тайм.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.55 "Смеяться — не грех". Развлекательная программа "Понедельник с "Христофором".
22.15 "В бой идут одни "старики". Худ. фильм.
23.45 Белорусский дом. "Наследие".
0.30 Криминальная хроника.

ОРТ

17.00, 0.55 Новости.
17.20 "Роковое наследство".
18.05 Час пик.
18.30 Угадай мелодию.
19.00 Понедельник с Познером. Программа "Мы".
19.05 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.40 "Офицеры". Худ. фильм.
22.40 Музыкальная программа к Дню защитников Отечества.
23.25 "Ожидание полковника Шалыгина". Приключенческий фильм.

Канал "Россия"

16.00, 19.00, 22.30 Вести.
16.35 Кроссворд.
17.15 "Виктория". Фестиваль солдатской песни.
19.30 Подробности.
19.45 "Санта-Барбара".
20.45 Олег Газманов в программе "Господа офицеры-98".
22.55 Дежурная часть.
23.10 Мой Пушкин.
23.15 Автошоу.
23.45 Товары — почтой.

ВТОРНИК, 24

БТ

7.00 Доброе утро, Беларусь!
8.00, 13.00, 15.00, 18.00, 0.25 Новости.
8.15, 19.25 "Сегодня с вами..."
8.50 Музыкальный антракт.
9.05 ТВ — школе. Музыка. 6-й класс.
9.35 "Вас вызывает Спортландия".
10.20 "Я рисую".
10.35, 18.20 "Глухарь". Заключительная серия.
11.00 Док. фильм.
11.25 Око.
11.45 Компьютерный полигон.
12.05 Четвертое измерение.
12.30 Акколада.
13.15 Б. Брехт. "Трехгрошовая опера". Телеверсия спектакля Альтернативного театра.
14.20 Телеочерк.
14.35 "Макаенка, 9".
15.10 Видеокурс французского языка.
15.50 ТВ — школе. История Беларуси. 8-й класс.
16.20 Мультфильм.
16.30 Уроки Н. Новожиловой.
17.00 Телеочерк.
17.00 Гости в дом.
17.25 Многоголосие.
18.50 Самбо.
19.20 Белорусский хит-парад.
20.05 Музыка без границ.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.55 Развлекательная программа "Спикер-хата".
22.15 "Часы остановились в полночь". Худ. фильм.
0.05 Международные спортивные новости.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.00 Новости.
8.15, 17.20 "Роковое наследство". Сериал.
9.00 "Мы".
9.45 Смехопанорама.
10.20 Домашняя библиотека.
10.30, 18.30 Угадай мелодию.
11.15 Программа "Вместе".
14.20 Мультсериал.
14.55 Счастливый случай.
15.40 "Приключения Робин Гуда". Сериал.
16.10 ..До 16 и старше.
16.30 Вокруг света.
18.05 Час пик.
19.00 "Тема".
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.40 Комедия "За двумя зайцами".
22.15 Песня-98.

Канал "Россия"

13.00, 16.00, 19.00, 22.30 Вести.
13.30 Детектив "Иллюзия смерти".
15.00 Почта РТР.
15.10 Торговый дом. "Ле Монти".
15.20 Мой Пушкин.
15.30 "Маленький бродяга".
16.30 Любовь с первого взгляда.
17.05 Бал Вячаслава Тихонова.
19.30 Подробности.
19.45 "Санта-Барбара".
20.50 "Собачий мир".
21.20 "Петербургские тайны". Телесериал.
22.55 Дежурная часть.
23.10 Мой Пушкин.
23.15 Звуковая дорожка.
0.15 Товары — почтой.

СРЕДА, 25

БТ

7.00 Доброе утро, Беларусь!
8.00, 13.00, 15.00, 18.00, 24.00 Новости.
8.15 "Сегодня с вами..."
8.55 Музыкальный антракт.
9.05 ТВ — школе. История Беларуси. 8-й класс.
9.35 Мультиклуб.
10.25 Телевизионный Дом кино.
10.50 Поэтические новеллы Валерии Леонтьевой.
11.00 Белорусский дом.
11.30 Видимо-невидимо.
12.30 "А музыка звучит..."
13.15 "Любочка". Худ. фильм.
14.30 Музыкальный салон с Элеонорой Езерской.
15.10 Видеокурс французского языка.
15.40 "5х5".
16.10 Видеокурс немецкого языка. Викторина.
16.30 Пограничье.
17.00 Телеочерк.
17.30 Судьба моя и надежда.
18.20 Док. фильм "Гостюхин".
18.55 Белорусский хит-парад.
19.00 Баскетбол. Чемпионат Европы. Мужчины. Беларусь — Англия.
19.35 Сделано в Беларуси.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.55 "Смеяться — не грех".
22.15 "Дьявольская жизнь". Худ. фильм.
0.15 Королевская охота.
0.55 Темная комната.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.35 Новости.
8.15, 17.20 "Роковое наследство".
9.00 Тема.
9.45 В мире животных.
10.20 Домашняя библиотека.
10.25 Джентльмен-шоу.
11.15 Программа "Вместе".
14.20 Мультсериал.
14.45 Классная компания.
15.15 Зов джунглей.
15.40 "Новые приключения Робин Гуда". Сериал.
16.10 ..До 16 и старше.
16.30 Вокруг света.
18.05 Час пик.
18.30 "Золотая лихорадка".
19.10 Человек и закон.
19.45 "Спокойной ночи,малыши!".
20.00 Время.
20.40 Боевик "Время убивать".
22.50 Док. детектив. "Бриллианты графа Толстого. Французский след. 1980 год".

Канал "Россия"

6.30, 10.00,13.00, 16.00, 19.00, 22.30 Вести.
7.00 Дежурная часть.
7.15 Товары — почтой.
7.20 Медицинский вестник.
7.25 На заметку.
7.30 Деньги.
7.45 Графоман.
7.55 Православный календарь.
8.00 Маски-шоу.
8.30 Почта РТР.
9.05, 19.45 "Санта-Барбара".
13.40 "Софи". Худ. фильм. 1-я серия.
15.20 Мой Пушкин.
15.30 "Маленький бродяга".
16.30 Почта РТР.
16.40 Кроссворд.
17.15 Мелодрама "Одна на миллион".
19.30 Подробности.
20.45 Сам себе режиссер.
21.20 "Петербургские тайны".
22.55 Дежурная часть.
23.10 Мой Пушкин.
23.15 Живая коллекция.
0.10 Товары — почтой.

ЧЕТВЕРГ, 26

БТ

15.55 ТВ — школе. Музыка. 3-й класс.
16.15 Памяти П. М. Машерова. "Признание". Док. фильм.
17.00 "Куда пойти учиться?" Минское высшее полиграфическое училище.
17.25 Концертный сезон.
18.00, 24.00 Новости.
18.20 "Поздний ребенок". Худ. фильм.
19.30 Белорусский хит-парад.
19.35 "Сегодня с вами..."
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.55 "Смеяться — не грех".
22.15 "Только не уходи". Худ. фильм.
23.30 Крок.
0.15 Акколада.

ОРТ

14.00, 17.00, 22.50 Новости.
14.20 Мультсериал "Невероятные приключения Джонни Квеста".
14.45 Классная компания.
15.15 Лего-го!
15.40 "Новые приключения Робин Гуда".
16.10 ..До 16 и старше.
16.30 Вокруг света.
17.20 "Роковое наследство".
18.05 Час пик.
18.30 "Эти забавные животные".
19.05 "В поисках утраченного".
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.40 Комедия "Мужчина для молодой женщины".
22.20 Сериал "Каскадеры. Мир трюков".

Канал "Россия"

6.30, 10.00, 16.00, 19.00, 22.30 Вести.
7.00 Дежурная часть.
7.15 Товары—почтой.
7.20 "Стронг" представляет.
7.25 На заметку.
7.30 Деньги.
7.45 Графоман.
7.55 Православный календарь.
8.00 Вовремя.
8.30 Сам себе режиссер.
9.05, 19.45 "Санта-Барбара".
13.35 "Софи". Худ. фильм. 2-я серия.
15.00 Мой Пушкин.
15.10 Почта РТР.
15.25 "Маленький бродяга".
17.00 Любовь с первого взгляда.
17.30 "Мужской зигзаг". Худ. фильм.
19.30 Подробности.
20.50 Довгань-шоу.
21.20 "Петербургские тайны". Телесериал.
22.55 Дежурная часть.
23.10 Мой Пушкин.
23.15 Подиум д'арт.
23.40 Лучшие игры НБА.
0.25 Товары — почтой.

ПЯТНИЦА, 27

БТ

7.00 Доброе утро, Беларусь!
8.00, 13.00, 15.00, 18.00, 0.05 Новости.
8.15, 19.25 "Сегодня с вами..."
9.15 Премьера песни.
9.30 Королевская охота.
10.10, 18.20 "Дочь Махараджи". Телесериал.
11.05 Туробъектив.
11.25 Зорная ростань. Телеконкурс молодых артистов эстрады.
12.00 Гости в дом.
12.25 "А музыка звучит..."
13.10 "Валентин и Валентина". Худ. фильм.
14.35 Окружающая среда. Социальная защита ликвидаторов аварии на ЧАЭС.
15.10 Видеокурс французского языка.
15.40 "Родное слово".
16.05 Белорусский меридиан. "Дорогами войны 1812 года".
16.30 Концертный сезон.
17.00 Уроки Н. Новожиловой.
17.30 "Между прошлым и будущим".
19.20 Белорусский хит-парад.
20.05 Бездельник.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.55 "Смеяться — не грех".
22.15 "Железное алиби". Худ. фильм. 1-я и 2-я серии.
23.55 Авто-парк.
0.20 Риск-версия.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.05 Новости.
8.15, 17.20 "Роковое наследство".
9.45 Клуб путешественников.
10.30 Домашняя библиотека.
10.40 Мультфильм.
11.15 Программа "Вместе".
14.20 Приключенческий фильм "Оливер Твист".
15.55 Улица Сезам.
16.25 "50х50".
18.10 Здоровье.
18.45 Поле чудес.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.40 Великие сыщики: детектив "Коломбо теряет терпение".
22.15 Взгляд.
23.20 Триллер "Там, где правда".

Канал "Россия"

6.30, 10.00, 16.00, 19.00, 22.30 Вести.
7.00 Дежурная часть.
7.15 Товары — почтой.
7.20 "Стронг" представляет.
7.25 На заметку.
7.30 Деньги.
7.45 Графоман.
7.55 Православный календарь.
8.00 "Красная книга".
8.30 "Собачий мир".
9.05, 19.45 "Санта-Барбара".
13.35 "Ничего личного". Кинокомедия.
15.20 Мой Пушкин.
15.30 "Маленький бродяга".
16.35 Кроссворд.
17.10 Мелодрама "Женщина дня".
19.30 Подробности.
20.50 "Городок".
21.20 "Петербургские тайны". Телесериал.
22.55 Дежурная часть.
23.10 Мой Пушкин.
23.15 "Душа". Благотворительный вечер.
1.00 Товары — почтой.

СУББОТА, 28

БТ

7.00 Доброе утро, Беларусь!
8.00, 15.00 Новости.
8.15 "Дом собаки". Сериал.
9.05 "Остров вдохновения".
9.20 Слово Митрополита Минского и Слуцкого, Патриаршего Экзарха всея Беларуси Филарета на Великий Пост.
9.30 Здоровье.
9.55 Столица.
10.45 Сделано в Беларуси.
11.00 "С любовью к детям". Белорусскому детскому фонду — 10 лет.
12.00 "Все нормально, мама!"
12.30 Вершина мира.
13.55 "Познай себя".
14.20 Телеспорт.
15.10 Детский экран. "Улыбка Белой королевы".
16.10 Компьютерный полигон.
16.30 Киноальманах "Беларусь".
16.40 Ток-шоу "Это моя работа".
17.05 "Песню берите с собой".
18.00 Баскетбол. Чемпионат Европы. Мужчины. Беларусь — Украина.
19.45 "Из достоверных источников".
20.05 Ток-шоу "Карамболь".
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.55 "От всего сердца". Худ. фильм.
23.35 Третий тайм.
23.55 Белорусский хит-парад.
0.10 Бон тон.
0.35 Видимо—невидимо.

ОРТ

7.00 "Розыгрыш". Худ. фильм.
8.40 Лотто "Миллион".
8.45 Слово пастыря.
9.00, 14.00, 16.15 Новости.
9.10 Домашняя библиотека.
9.30 Музыкальная почта.
10.05 "Каламбур".
10.40 Возвращение Третьяковки.
11.05 Приключенческий фильм "Чрезвычайное происшествие".
14.20 Тайны "Титаника" в программе "Цивилизация".
14.50 В мире животных.
15.30 "Как это было": В тайваньском плену. 1954 год.
16.35 "Чердачок Фруттис".
17.15 Сериал "Спрут-4".
19.10 Джентльмен-шоу.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.55 Приглашает Концертная студия "Останкино".
21.55 "Безымянная звезда". Худ. фильм.
0.15 Боевик "Лед и пламя".

Канал "Россия"

6.00 Утренний экспресс.
6.50 Утро крестьянина.
7.20 На дорогах России.
7.35 Поле зрения.
8.00 Мультфильм.
8.35 "Мак и Матли".
9.00 "Позвоните Кузе".
9.30 Доброе утро, страна!
10.15 Почта РТР.
10.45 Музыкальный ринг — новое поколение. Валерий Леонтьев 80-х против Валерия Леонтьева 90-х.
12.25, 20.45 Мой Пушкин.
12.30 "У всех на устах".
13.00, 19.00 Вести.
13.30 Люди и деньги.
14.00 Федерация.
14.55 "Закон и порядок". Телесериал.
15.50 Почта РТР.
16.00 Русский бой.
17.00 Совершенно секретно.
17.55 Моя семья.
19.45 "Аншлаг" и К.
20.50 Творческий вечер Игоря Николаева.
0.05 Армен Джигарханян, Георгий Вицин, Ольга Сумская и Борис Романов в экранизации "Декамерона" Джованни Бокаччо "Несколько любовных историй".

ВОСКРЕСЕНЬЕ, 1

БТ

7.00 Доброе утро, Беларусь!
8.00, 15.00 Новости.
8.20 "Дом собаки". Сериал.
9.10 "Все про все".
9.35 "Земля кладов". Спортивно-историческая игра для подростков.
10.00 Туробъектив.
10.25 "Все нормально, мама!".
10.55 "Чудеса мира".
11.25 Марсово поле.
11.50 "Навстречу". Клип-концерт ансамбля флейтистов "Сиринкс".
12.15 "Телек-шоу".
12.35 "Зонтик для новобрачных". Худ. фильм.
14.05 Олимп.
14.25 Приглашаем на вечерки.
15.15 Сельчане.
15.40 Силач.
16.20 Зорная ростань.
16.55 "Мой дядя — инопланетянин". Худ. фильм.
18.25 Теленавигатор.
18.45 "Приглашение". Воскресный вечер с Валерием Дайнеко.
19.40 Колыбельная.
20.00 Резонанс.
20.50 Телебарометр.
21.05 Стадион.
21.30 "Три цвета: белый". Худ. фильм.
23.05 Премьера песни.
23.20 "В джазе только девушки".
23.45 Бархатный сезон.

ОРТ

7.00 Худ. фильм "Когда я стану великаном".
8.30 "Дисней-клуб".
8.55 Спортлото.
9.00, 14.00, 23.30 Новости.
9.10 "Непутевые заметки" Дм. Крылова.
9.30 Пока все дома.
10.10 Утренняя звезда.
11.00 Армейский магазин.
11.30 "Играй, гармонь любимая!".
12.00 Крестьянские ведомости.
12.30 Сериал "Подводная одиссея команды Кусто".
13.25 Смехопанорама.
14.20 Клуб путешественников.
15.05 Футбольное обозрение.
15.40, 16.05 "Дисней-клуб".
16.35 Колесо истории.
17.25 "Золотая серия". "Тот самый Мюнхгаузен".
19.55 Киноафиша.
20.00 Время.
20.35 Мистический триллер "Леди-ястреб".
23.00 Мировая премьера. Виктор Третьяков — лауреат премии имени Д. Шостаковича 1998 года.
23.45 Приключенческий фильм "Разорванная цепь".

Канал "Россия"

6.00 Утренний экспресс.
6.50Служу Отечеству!
7.20 "Там-там".
8.10 Мультфильм.
8.35 "Мак и Матли".
9.00 "Позвоните Кузе!".
9.25 Доброе утро, страна!
10.15 Русское лото.
11.00 Мир книг с Леонидом Куравлевым.
11.20 "Жестокая фантазия". Худ. фильм.
12.25, 20.05 Мой Пушкин.
12.30 Почта РТР.
13.00 Вести.
13.30 Пульс.
14.00 Парламентский час.
15.00 "Закон и порядок". Телесериал.
16.00 Док. фильм. "Естественный отбор".
16.55 Очевидное — невероятное. Век XXI.
17.30 Старая квартира. 1966 год. Часть 2-я.
19.00 Зеркало.
20.10 "Сицилиец". Худ. фильм.
22.45 Сиреневый туман.
23.25 Петр Фоменко в программе "Фрак народа".
0.25 Вовремя.



Калектыў настаўнікаў і работнікаў Любішчыцкай СШ выказвае глыбокае спачуванне апаратару газавай кацельні Снітко Ірыне Рыгораўне з прычыны напаткаўшага яе вялікага гора — смерці БАЦЬКІ.

● БИБЛИЮ ЧИТАЕМ ВМЕСТЕ

Депрессия

Опасная, прогрессирующая болезнь нашего века – депрессия — претендует сегодня на второе место в мире! Это латинское слово означает подавленность, пресс, давление. Удрученное состояние, недовольство, неуверенность в жизни. Страх за завтрашний день, пустота, унылый дух, стесненность мыслей и чувств. Двадцать процентов больных, обращающихся за медицинской помощью и не подозревают, что главной причиной их заболеваний явилась депрессия.

Этой болезнью поражены сегодня около шестидесяти пяти процентов людей пожилого возраста, но болезнь стремительно «молодеет». Видя подавленность пожилых людей, молодежь старается не думать о старости. Устраняя из сознания мысли о неизбежной старости, молодые люди пытаются получить все возможное от жизни, пользуясь молодостью. Понимая старость как нечто болезненное, нежеланное, они предпочитают прекратить жизнь до ее наступления. Поэтому самоубийство, преступность, вседозволенность также являются результатом депрессии. Не добиваясь желаемого в молодости, панически страшась старости, человек, попавший в западню, погружается в темные воды депрессии.

Депрессия известна с давних времен. Еще древнегреческий философ Гипократ описывал ее свойства и последствия. Ею страдали Гоголь, Эдгар По, Черчиль, Шуман, Скрябин, Ван Гог, Шостакович.

ПРОЯВЛЕНИЕ БОЛЕЗНИ. Нарушение сна, от постоянной сонливости до мучительной бессонницы. Изменение потенции, что особенно мучительно сказывается у мужчин. Потеря радости в работе, неряшливость в одежде, небрежность в гигиенических нормах по отношению к собственному телу. Неприятные запахи от тела в связи с развитием неправильного обмена веществ. Потливость. Потеря жизнерадостности, любовь к родным, детям, друзьям. Чувство страха даже в тех случаях, когда нет к тому никакого основания. Осознание ненужности, бесполезности. Желание справиться со всеми проблемами самому. Отрицание того, что тебя любят, хотят помогать, понимают. Слезливость, неверие и неуверенность, сомнение даже в очевидном. Избегание бесед, общений. Недовольство даже в случае успеха. Желание постоянного одиночества, отторжение яркого света, красок, раздражение по поводу успеха других. Тяга к спиртному, наркотикам. Самоунижение, самокритика, лишенная всякого основания.

Проявление депрессии наблюдается и при исследовании библии, где описываются люди, потерявшие духовные, душевные, физические устои жизни. Псалом 31 повествует о мучительном состоянии согрешившего царя Давида. Книга Иова (глава 7) рассказывает о страданиях человека, сраженного душевными и телесными испытаниями.

ВИДЫ ДЕПРЕССИЙ. 1. Эндогенная. Заболевание центральной нервной системы чаще всего встречается у людей престарелого возраста. Такой человек нуждается во врачебной помощи и параллельно в помощи опытного духовного наставника (пастора, священнослужителя).

2. Органическая. Реакция нервной системы на изменения в организме. Переходный возраст у подростков, периоды женского очищения, родовые периоды (до, после). У женщин, мужчин в 40—45 лет в связи с этапной переоценкой результата, смысла жизни, анализа прошлого и ожидания будущего.

3. Атеистическое мировоззрение приводит к потере всякой веры, бессмысленности существования.

4. Реактивные. Реакция человека на перемены обстоятельств жизни, политическая, экономическая нестабильность. Потеря близких людей, разлука с любимым человеком, делом, местом жительства. Выход на пенсию, разрыв с друзьями, крушение надежды, неправильно поставленных целей. Разочарование в браке, реакция на совершенный грех.

5. Оккультная обремененность. Любое касание (активное или пассивное) к спиритическим (вызывание духов), гипнотическим, еретическим действиям. Кодирование, астрология, ворожейство, гадание и т. п.

ПОМОЩЬ ПРИ ДЕПРЕССИЯХ. Установить вид депрессии. Открыть проблему в свете слова Божия (библия). Если есть необходимость, обратиться к врачу, не занимающемуся оккультным вмешательством (желательно к христианину). Проявить к больному глубокую любовь, терпение, открыть больному любовь (к нему лично) Бога. Больной должен видеть в вас нежность, уверенность, жизнеутверждающий дух. Нельзя пугать, ставить условия, упрекать. Если установлен конкретный грех, требуется волевое (со стороны больного) исповедание и желание доброго действия по преодолению греха. Если есть непрощение, обида, вражда, требуется исповедание и примирение, обращение к Богу.

Помните, Иисус Христос-Победитель всякого зла. Надежда на Его помощь приведет к успеху.

Священнослужитель Церкви «Рождества Христова»
КОНСТАНТИН.

СЕРДЕЧНО ПОЗДРАВЛЯЕМ



Дорогой наш отец и дедушка МАКАРЕВИЧ Константин Андреевич из г. Ивацевичи!


Сердечно поздравляем тебя с днем рождения! Борись, крепись и будь здоровым — вот наши тебе искренние пожелания.

Дни рожденья много раз бывают,
И сегодня в светлый день такой
Мы от всей души тебе желаем
Жизни светлой, долгой и большой!
Пусть лицо озаряет улыбка,
И не старится сердце вовек!
Ты для нас самый нужный на свете,
Самый близкий родной человек!

Твои дети, внуки.

ВАШЕ ПИСЬМО

Курортный роман



Я — человек уже немолодой. Отдыхал в этом году в санатории «Полесье». И встретился с женщиной, которую, кажется, полюбил по-настоящему. Сейчас моя жизнь превратилась в ад: я мучаюсь от сознания вины перед женой и детьми. Мало этого, я страдаю от того, что моя последняя (да, наверное, и единственная) любовь проходит мимо. Написал все это в вашу газету потому, что она выходит далеко от моего дома (а кому-то нужно хотя бы пожаловаться). Что же вы скажете на все это?

(И. К-ов), санаторий «Полесье», г. п. Телеханы.

Вместо ответа мы предлагаем нашему читателю (и всем остальным также) интервью московского психолога и сексопатолога **Игоря ПЕРОЖКА**, который исследует проблему курортных романов. Итак, как быть с курортными романами?

— Начну с того, что масштабы курортных адюльтеров преувеличены. Кто-то, приехав на курорт без супруга, тем не менее, занимается «невинными» делами – читает, посещает экскурсии, занимается спортом, не отказывает себе в такой «роскоши», как здоровый образ жизни. Но большинство балуется любовной интрижкой. На курорте полностью изменена обстановка: здесь нет злого начальника, авралов, домашних хлопот, проблем с детьми. Здесь нет даже финансовых трудностей, потому что в отпуск обычно едут с деньгами.

Огромное психологическое влияние на мужчину оказывают всяческие истории и анекдоты «про курорт». Разумеется, в них все преувеличено в несколько раз, но все же... Когда друзья рассказывают о своих мужских победах, он досадует: чем я хуже! Подспудно в нем зреет уверенность: курорт – это место, где надо, где принято искать любовных приключений.

— А что заставляет женщину забыть о супружеском долге!

— Ну, бывают женщины, которые просто по природе своей стремятся соблазнить как можно больше мужчин – даже если вполне довольны собственным мужем. И, разумеется, на курорте они своего шанса не упустят. Но это исключения. НЕКОТОРЫХ (подчеркиваю: не всех, а некоторых) женщин заставляют забыть о супружеской верности прелести и преимущества курорта. Представьте: из холодной России женщина попадает в какую-нибудь Хургаду. Африка. Пальмы. Лазурное море. Сервис! Какой контраст с повседневностью! Ею восхищаются и аборигены, и «ожившие» на солнышке соотечественники. А мужское внимание польстит любой женщине. И она решает, что ничего дурного не случится, если она позволит себе «отдохнуть по полной программе». Но каждый случай женской измены надо рассматривать индивидуально. Обычно женщина идет на это, если ее что-то не устраивает в собственном супружестве, но до развода она еще не дозрела, да и не обязательно дело должно до него дойти. В этом случае курортный роман придаст ей уверенности в себе, разнообразит ее не очень-то интересную жизнь. Любовная интрига напомнит ей о счастливых периодах – о первой любви, о времени, когда она была невестой. Возможно, она снова переживет такие же захватывающие моменты. Эти эмоции благотворно влияют и на физическое, и на душевное здоровье. Недаром женщины, которые «крутили роман» на курорте, возвращаются из отпуска такими сияющими и помолодевшими. Если женщине повезло с партнером, и благодаря адюльтеру она получила новый сексуальный опыт, то это положительно скажется на ее семейных отношениях. То есть, на уровне «вредно-полезно» курортные романы скорее полезны для женщины. Хотя, как известно, отношение в обществе к женским «загулам» более нетерпимое, чем к мужским. «Когда изменяет муж — это плевок на улицу. Когда изменяет женщина — это плевок в дом», — гласит кавказская поговорка. У нас – не Кавказ, но оценка поведения «распутной» жены почти так же категорична.

— А для мужчины, получается, курортная интрижка «полезна» вдвойне!

— Да. Мужчина – существо более склонное к полигамии, чем женщина. У него существует биологическая потребность «познать» как можно больше женщин. А мимолетный, ни к чему не обязывающий «романчик» на море, о котором никогда не узнает жена, — идеальный вариант измены.

— Но для мужчины «романчик» во время отпуска — это, как правило, шалость, за которой не стоит серьезных чувств. Женщина переживает любовь – даже мимолетную – гораздо глубже. Она долго будет вспоминать своего любовника, ждать от него обещанного. Она может затосковать. Вы и после этого утверждаете, что курортные романы благотворно влияют на женщин!

— Тоска по курортному любовнику – вовсе не типичная ситуация. А «тяжелые случаи» – депрессии, суицидальные настроения из-за расставания, к счастью, явления довольно редкие. Обычно женщина прекрасно понимает, что ее любовное приключение закончилось вместе с отпуском и не ждет продолжения.

Но давайте разберемся, почему женщина страдает? Она считает: «Мне было с ним очень хорошо». Ленивую южную жизнь, дивное море, пальмы и прочие красоты она неразрывно связывает с образом того мужчины. И не предполагает, что и без него ей было бы совсем неплохо. Если она проанализирует свои чувства, а потом спросит себя, чего она, собственно, хочет: встретиться с любовником или снова оказаться на курорте, она, скорее всего, выберет курорт. И правильно сделает. Потому что в привычных городских «декорациях» тот мужчина наверняка окажется не таким уж и идеальным. Обычно, когда женщина предпринимает попытки встретиться с курортным любовником в будничной жизни, выясняется, что он не такой галантный, не такой щедрый, не такой остроумный, каким казался на юге. Это ли не доказательство того, что романтический антураж курорта может ввести женщину в заблуждение!

— Непрочность курортных романов — такой же стереотип, как и их «неизбежность» во время отпуска. Но ведь наверняка бывает, что адюльтеры перерастают в нечто более серьезное.

— Вообще-то, в жизни случается все. Действительно, бывает, что несерьезные интрижки перерастают в мощное чувство и круто изменяют людям жизнь. Одна моя пациентка вынуждена была обратиться за поддержкой к психотерапевту как раз из-за того, что ее падкосила ситуация, которую в нарс де называют «меж двух огней». С мужем у нее были напряженные отношения, а на курорте она встретила богатого красавца. Тот в нее по-настоящему влюбился. И она ответила взаимностью. Отпуск закончился, а их отношения продолжались, любовник уговаривал ее развестись и выйти замуж за него. Но женщина боялась разлучать своих детей с отцом, и поэтому мужественно боролась со своим чувством.

— И что вы ей посоветовали!

— Разумеется, лечение. А чисто по-человечески... Я сказал, что не стоит обманывать судьбу. Ведь ей повезло – к ней пришла любовь. А сколько людей за всю жизнь ни разу не испытали это чувство!

Газета выдаецца на беларускай і рускай мовах. Набіраецца ў Івацэвічах, друкуецца ў Баранавіцкай друкарні (г. Баранавічы, вул. Савецкая, 80). Выходзіць два разы на тыдзень: у сераду і суботу.
Фармат 420х300 мм. Аб'ём — 1 друк. аркуш.
Падпісана да друку 20 лютага ў 9.00.

Заснавальнік: рэдакцыя "Газеты для вас"
Газета зарэгістравана ў Дзяржаўным камітэце РБ па друку. Пасведчанне № 694.

РЭДАКТАР ЛІДЗІЯ ЦАЛУЙКА.
НАШ АДРАС: рэдакцыя "Газеты для вас".
вул. Дзяржынскага, 30, 225250, г.Івацэвічы.
Тэлефон: 8 (245) 2-12-29.

Тыраж 1300.
Заказ 420.